УДК 82.09

***Т. Р. Багарадава***
*аспірант каф. гісторыі беларускай літаратуры*
*Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта,*
*ст. выкладчык каф. славянскай філалогіі Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта*
e-mail: bogoradova1974@yandex.ru

# ПОСТСАВЕЦКІ КАНТЭКСТ ВАЧЫМА ВЕТЭРАНА ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ (НА МАТЭРЫЯЛЕ АПОВЕСЦЕЙ 1980–1990-х гг. В. АСТАФ'ЕВА, Р. БАКЛАНАВА, В. КАЗЬКО)

*Разглядаецца асэнсаванне тэмы Вялікай Айчыннай вайны рускімі пісьменнікамі-франтавікамі, прадстаўнікамі «лейтэнанцкай прозы» В. Астаф'евым і Р. Бакланавым, а таксама беларускім пісьменнікам, сведкам ваенных падзей В. Казько ў жанры аповесці, створанай у познесавецкі і паслясавецкі час. Аўтараў яднае зварот да праблем ветэрана ў эпоху перабудовы і грамадскіх пераўтварэнняў другой паловы 1980–1990-х гг. Пісьменнікі адлюстравалі праявы грамадска-палітычнага крызісу і яго наступствы: працэсы пераасэнсавання ідэалаў, скасаванне былых ідэалагічных прыярытэтаў, сацыяльныя і псіхалагічныя траўмы воіна-ветэрана ў постсавецкім грамадстве.*

**Уводзіны**

Другая палова 1980-х – 1990-я гг. сталі часам кардынальных змен ва ўсіх сферах быцця для жыхароў былых саюзных рэспублік. У эканамічнай, экалагічнай і палітычнай сферах адбыліся пераўтварэнні, якія мелі для шараговага прадстаўніка грамадства не толькі станоўчыя вынікі, але і шмат траўматычных.

У сферы культуры, літаратуры вызначыліся зрухі ў бок пашырэння тэматычных і праблемных абсягаў, якія абудзілі чарговую хвалю цікавасці да спрэчных пытанняў з часоў Вялікай Айчыннай вайны. Відавочнай стала неабходнасць удакладнення яе ролі ў гісторыі постсавецкіх нацый і народаў былога СССР. Па словах даследчыкаў, узнікла сітуацыя «вострай актуальнасці гуманістычнай і антыфашысцкай літаратуры» [1, с. 11]. Аўтары савецкай ваеннай прозы ва ўмовах новай свабоды слова памкнуліся абнавіць і дапоўніць ваенны дыскурс. Адказам на павевы часу сталі цесныя літаратурныя стасункі і ўзаемадачыненні былых ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, а таксама сведкаў яе падзей. Па словах беларускага вучонага С. Андраюка, «асаблівай інтэнсіўнасцю пазначаны 1986–1993 гг. Літаратурны працэс гэтых гадоў, можа, як ніколі быў багаты і разнастайны, літаратурнае жыццё – інтэнсіўным» [2, с. 9].

Падчас змены гісторыка-культурнай парадыгмы на мяжы стагоддзяў пераасэнсаванне ваеннага кантэксту і мастацкі аналіз пазнейшых сацыяльных канфліктаў сталі фактамі літаратурнага адлюстравання найперш у аповесцях прадстаўнікоў савецкай «лейтэнанцкай прозы». Калізіі постсавецкага грамадства раскрыты ў аповесцях расійскіх аўтараў В. Астаф'ева, Р. Бакланава, а таксама айчынных пісьменнікаў В. Быкава, І. Навуменкі, І. Шамякіна і інш. В. Казько разглядаў адзначаны кантэкст з пазіцыі чалавека, які не прымаў непасрэднага ўдзелу ў ваенных дзеяннях, але з'яўляўся іх сведкам.

Мэта працы – прааналізаваць змест і паэтыку адлюстравання ў прозе 1980–90-х гг. абставін быцця ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны аўтарамі з постсавецкай прасторы. Задачамі даследавання з'яўляюцца: 1) вызначэнне ідэйна-эстэтычных канцэпцый раскрыцця ваеннай тэмы В. Астаф'евым, Р. Бакланавым і В. Казько на мяжы XX–XXI стагоддзяў; 2) выяўленне мастацкай спецыфікі адлюстравання постсавецкага быцця ў аповесцях названых аўтараў.

Навуковы кіраўнік – Л. Д. Сінькова, доктар філалагічных навук, прафесар кафедры гісторыі беларускай літаратуры Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта

Репозиторий БрГУ

**Аўтабіяграфізм прозы пра вайну**

Расійскіх пісьменнікаў Віктара Астаф'ева (1924–2001), Рыгора Бакланава (Фрыдмана) (1923–2009) і беларускага аўтара Віктара Казько (нар. у 1940 г.), майстроў у жанры аповесці, яднаюць не толькі храналагічныя рамкі творчай дзейнасці, але і агульнасць шэрагу тэм і матываў, безумоўная прыхільнасць да аўтабіяграфічнага пачатку. Для ўсіх трох аўтараў характэрна гранічна праўдзівае адлюстраванне ваенных падзей і сучасных рэалій.

У творчасці В. Астаф'ева прадстаўлена абноўленая версія рэалістычнай традыцыі. Пісьменнік спалучыў натуралізм адлюстравання (праз дакументальны пачатак, працу з ваеннай фактаграфіяй і ўласны досвед) з лірызмам, які выявіўся праз наратарскае «Я». Разважаючы пра сутнасць творчасці пісьменніка, П. Басінскі адзначаў: «У яго прозе ёсць сапраўды нешта, на першы погляд, цяжкаўлоўнае, але ўзвышанае над самымі бліскучымі выразамі іншых пісьменнікаў. Не магу інакш вызначыць гэта "нешта", як праз банальнае паняцце слёзы. У бясслёзнае стагоддзе Астаф'еў прымусіў нас плакаць сапраўднымі, не кракадзілавымі слязьмі» [3] (тут і далей пераклад з рускай мовы наш. – *Т. Б.*). Адным з трох планаў адлюстравання ў інтэлектуальнай прозе В. Астаф'ева (побач з тэкстамі пра вайну і дзяцінства) з'явілася сучасная аўтару рэчаіснасць, лёс савецкага і постсавецкага грамадства, яго прадстаўнікоў. Паводле Л. Фаменка, «ужываецца ў яго творчасці аголеная жыццёвая праўда з паэтычна прыгожым у вясковым, часам нават у старавясковым асяроддзі» [4].

Шлях Р. Бакланава да аповесці пра ваенныя падзеі ляжаў праз кантэкст вясковай прозы. Вайна ў творчасці пісьменніка пачала выяўляцца не толькі як народны подзвіг, але і як найвялікшае зло і нават катастрофа. Даследчыкі адзначалі, што «вайна стала галоўнай падзеяй у жыцці Рыгора Бакланава, як і многіх іншых людзей яго пакалення – яны проста мала што акрамя яе ведалі» [5]. Сучаснасць вымяралася аўтарскімі персанажамі па аршынах вайны, з пазіцый перажытага і выпакутаванага. Аўтабіяграфізм стаў дамінантай творчасці, «аснова кніг Рыгора Бакланава – "акопная праўда"… гады, праведзеныя тады яшчэ юнаком у жорсткіх сутычках на перадавой» [6].

Драматычны вопыт В. Казько, звязаны з уласнай трагедыяй дзяцінства, сіроцтва, са знаходжаннем у дзіцячых дамах Палесся, выявіўся ў творах беларускага пісьменніка пра быццё хлопчыка пад акупацыяй, а таксама ў пазнейшы перыяд. Працягнуты ён і падчас інтэлектуалізацыі беларускай літаратуры ў 1990-я гг., калі наспела неабходнасць прааналізаваць і падсумаваць назапашаны матэрыял, у тым ліку пра Вялікую Айчынную вайну. Крытыкі канстатавалі, што «творы Казько пазначаны драматызмам, перакананальнасцю, псіхалагізмам» [7].

**Мастацкія сродкі адлюстравання быцця былым франтавіком**

Перыяд «перабудовы» і трапна вызначаных народам «ліхіх 90-х» пэўным чынам змяніў адносіны да падзей мінулай вайны і яе ўдзельнікаў. Пасля распаду СССР у 1991 г. на постсавецкай прасторы парушылася ўся бюракратычная сістэма, з механізмамі сацыяльнага забеспячэння ўключна. У выніку ў шэрагу былых саюзных рэспублік ветэраны вайны часта апыналіся ў стане занядбання. Ключавым у аповесцях аўтараў-ветэранаў 1980–1990-х гг. стаў матыў памяці пра мінулую вайну. У адрозненне ад былых клішэ «свяшчэннай памяці», успаміны удзельнікаў падзей ці іх сведкаў азмрочаны несправядлівымі да іх адносінамі і абыякавасцю грамадства: *«А чаго плакаць, чаго скавытаць? Самі здабывалі сабе гэта жыццё. Самі! <…> Вось яна табе – свабода і незалежнасць, вось яна – Радзіма, ператвораная ў могільнік. Вось яна – абяцаная гаваркімі камісарамі мілата»* [8]. Незапатрабаванасць і адрынутасць ветэранаў выразна прасочваецца ў трох напісаных у 1990-я гг. аповесцях В. Казько з кнігі «Час збіраць косці» (2014): «І нікога, хто ўбачыць мой страх», «Час збіраць косці», «Прахожы». Гонар нацыі, былыя ўдзельнікі барацьбы з фашызмам, якія падчас вайны

Рэпазіторый БрДУ

са зброяй у руках здабывалі сваёй краіне свабоду і ў мірны перыяд працягвалі служыць ёй верай і праўдай, у постсавецкай рэчаіснасці сталі запатрабаваныя не Радзімай, а замежнымі краінамі: *«Усе яны Ашыры, майстры на чужыне. І ніводнага прарока ў сваёй роднай хаце. Пустэча, пустэча, пустэча»* [9, с. 7].

Важным звяном ланцуга ў характарыстыцы постсавецкага грамадства стала акцэнтаваная пісьменнікамі праблема колькасці крыві, пралітай за перамогу над гітлераўскім фашызмам, шматлікіх чалавечых ахвяр у ходзе Другой сусветнай вайны. Разам з іншымі пісьменнікамі В. Астаф’еў, Р. Бакланаў і В. Казько сцвярджалі, што чалавечае жыццё з’яўляецца той найвялікшай каштоўнасцю, якую ўлада і грамадства павінны ашчаджаць і ў ваенных, і ў мірных абставінах. Сведчаннем таму ў аповесці «Вясёлы салдат» («Весёлый солдат», 1998) з’явіліся згадкі В. Астаф’ева пра запознелае пакаянне былога «маршала Перамогі» Р. К. Жукава з кнігі ўспамінаў пра салдата былой вайны, выдадзенай адпаведна часавай запатрабаванасці: *«Сапраўды свет не бачыў больш цынічнай і бессаромнай крывадушнасці, таму што ніхто і ніколі так не смяціў рускімі салдатамі, як ён, маршал Жукаў! І калі многіх вялікіх палкаводцаў, зараз ужо апраўданых гісторыяй, можна і трэба назваць чалавечымі браканьерамі, маршал Жукаў ганарліва зойме сярод іх адно з першых месцаў»* [8].

Другая сусветная вайна мела шэраг наступстваў, самым галоўным з якіх стала вызваленне свету ад нацызму, гітлераўскай навалы і, у адносінах да былога СССР, – спробы пабудовы пасля яе завяршэння больш дасканалага грамадства. Разам з тым пісьменнікі сцвердзілі думку пра неапраўданасць былых ідэалаў, якія патанулі ў пасляваеннай рэчаіснасці, не знайшлі ў ёй выніковай рэалізацыі, больш за тое, з’явіліся своеасаблівым каталізатарам разбуральных працэсаў у постсавецкія гады. Стварылася сітуацыя неапраўданасці і несправядлівасці замоўчвання многіх з тых ахвяр, што былі прынесены на алтар дзяржавы, незалежнасці, свабоды, самой будучыні, і гэтае замоўчванне ды забыўлівасць грамадства балюча ўспрымалася ветэранамі: *«Але ўсё іх колішняе маладое жыццё сабаку пад хвост. Разам з крывёй пад Магілёвам і Брэстам, Масквой, Варшавай і Берлінам»* [9, с. 152].

Адсюль вынікае цэлы ланцуг праблем ва ўсіх грамадскіх сферах часоў перабудовы і пазнейшых, акцэнтавана адзначаных рускімі і беларускім пісьменнікамі: крах палітычнай сістэмы, звязанай з крывадушным замоўчваннем праўды пра найвялікшыя народныя ахвяры, недасканаласць прававой сферы, разгул злачыннасці, сацыяльная безабароннасць асобы, дэвальвацыя маральных прынцыпаў і ідэалаў, афганская і чарнобыльская праблематыка і г. д.: *«І, падобна, гэтую непавагу да чалавека і чалавечага, хоць мо і падсвядома, але вельмі выразна адчулі і зразумелі перш-наперш дзеці… Падымалася, прарастала атручанае, ачмуранае часам пакаленне»* [9, с. 27]. У постсавецкія гады эпахальныя змены абвастрылі праблемы існаванне ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны. Негатыўнае стаўленне да палітычных прынцыпаў мінулых часоў маштабна выявілася падчас татальнага дэструктывізму постсавецкай эпохі. Здавалася, што беспакаранасць зла пасярод сацыяльнай катастрофы пераканаўча навязвае суцэльны нігілізм, у тым ліку і ў адносінах да вынікаў перамогі ў вайне і яе былых салдат. Былі саркастычна паніжаны тыя маральныя ідэалы, якія заўсёды існавалі ў сумленных людзей поруч з дэкларатыўнымі лозунгамі мінулай эпохі. Гэтыя рэаліі адназначна разбуральна паўплывалі на самапачуванне, псіхіку былых абаронцаў Айчыны. Жорсткае грамадства, у якім адкрыта і нахабна запанаваў мацнейшы, не абараняла ахвяр амаральнага зла, якое цкавала «лёгкую здабычу», у тым ліку і тых, каму было абавязана сваім існаваннем. Гэты факт па-мастацку абвострана паказаны В. Казько ў аповесці з сімвалічнай назвай «Час збіраць косці» – праз апісанне апошніх хвілін жыцця былога ветэрана, што прымаў удзел у знакавай ваеннай аперацыі «Баграціён»: *«Памёр у сталіцы. Дзе яго,*

Рэпазітарый БрДУ

*халоднага ўжо, і абрабавалі. Зрэзалі з гімнасцёркі салдацкі арданок Славы. Сарвалі з апруцянелай рукі гадзіннік»* [9, с. 152].

Пісьменнікі даводзілі думку пра адданасць былых франтавікоў маральным прынцыпам, падкрэсліваючы стойкасць іх ідэалаў у параўнанні са зменлівымі атрыбутамі дня сённяшняга. У аповесці «Журботны дэтэктыў» («Печальный детектив», 1987) В. Астаф’еў адзначыў самаадданае змаганне ветэранаў з праявамі гвалту і несправядлівасці, падаў ацэнку імі сённяшняй сітуацыі з пазіцыі ваеннай маралі: *«Суддзя чыгуначнага раёна Бекетава – справядлівая баба, асабліва суровая да гвалтаўнікоў і рабаўнікоў, таму што пад акупацыяй у Беларусі яшчэ дзіцём нагледзелася і натрывалася ад разгула іншаземных гвалтаўнікоў і рабаўнікоў, – уваліла ўсім чатыром аматарам жарсці па восем гадоў строгага рэжыму»* [10]. Былыя ветэраны па ваеннай памяці трывала абараняли грамадства ад бездухоўнасці, упарта змагаліся за «чысціню радоў»: *«Стары ваяка не вытрымаў, схапіў забойцу за горла, заваліў на падлогу»* [10].

Франтавікі, траўміраваныя вайной і адмоўнымі рэаліямі рэчаіснасці, у апошняй барацьбе з сацыяльнай несправядлівасцю паступова гублялі веру і ўпэўненасць у заўтрашнім дні. Расчараванне прыходзіла паралельна з адчуваннем бязмэтнасці мінулага і сённяшняга змагання, прыводзіла былых салдат да псіхалагічнага крызісу, маральнай аморфнасці, п’янства: *«Паглядзеўшы пільна на ледзь жывых ветэранаў, яна (Эра) прынесла з машыны кілішак каньяку, два “снікерсы” і, назіраючы, як цяжка апахмяляюцца, пакутліва паўстаюць да жыцця састарэлыя ваякі, пацягваючы цыгарэту, крыва ўсміхнулася* [11]. Р. Бакланаў у аповесці «Свой чалавек» («Свой человек», 1990) звярнуў увагу на ветэранаў, якія не змаглі самарэалізавацца ў пасляваеннай рэчаіснасці і ад роспачы думалі пра самагубства або абіралі своеасаблівую форму зыходу ад рэальнасці – маральную ці фізічную адзіноту: *«Мы з фашыстамі ваявалі, а фашысты дома чакалі нас. Няўжо з гэтым вярталіся з фронту? – казаў Лёня. – Такім уяўлялі сабе жыццё пасля вайны?»* [12].

Кожны з аўтараў адзначыў, што не апошнім фактарам маральнай дэградацыі асобы ў грамадстве стала савецкая прапаганда, наступствы якой пэўны час адклікаліся і на постсавецкай прасторы. Адмыслова «замбаваныя» савецкай сістэмай людзі сталага ўзросту ў пераважнай большасці так і не здолелі «перабудавацца» на новы лад, змяніць загартаваныя мінулым і вайной маральныя прынцыпы. У аповесці «Прахожы» В. Казько падсумаваў назапашаны чалавецтвам вопыт, зрабіў метафарычны намёк на адсутнасць гарманічнага існавання чалавека ў Сусвеце: *«Мне шкада было сваю родную матухну Зямлю. Я шкадаваў і чалавецтва, хаця, скажу шчыра, куды менш, чымсьці зямлю»* [9, с. 307].

У прыгаданых аповесцях В. Астаф’ева, Р. Бакланава, В. Казько перыяду 1980–1990-х гг. назіраецца зварот да былога гістарычнага хранатопа: пры мастацкім узнаўленні падзей межы саюзных рэспублік не браліся пад увагу, што сведчыць пра ўсеагульны характар перажытага – гэта вайна, абарона былой «вялікай Радзімы» СССР. Расійскія пісьменнікі-франтавікі паказвалі ваенныя дзеянні ў некаторых раёнах Беларусі, як, у сваю чаргу, беларускі аўтар В. Казько выкарыстаў рэаліі Расіі і замежжа. Крызісныя сітуацыі часоў вайны патрабавалі ад асобы максімальнай унутранай канцэнтрацыі, што адлюстроўвалася пісьменнікамі праўдзіва і без купюр. У перыяд 1980–1990-х гг. адбылося разняволенне творчай фантазіі майстроў слова, абвастрэнне іх памяці, жаданне данесці да суграмадзян тую праўду, што была ўсвядомлена пакаленнем ветэранаў і сведкаў Вялікай Айчыннай вайны. Эмацыянальныя выказванні ў названых аповесцях таксама зрабіліся безэўфемічнымі.

Рэпазіторый БрДУ

**Заключэнне**

Такім чынам, гісторыка-культурны кантэкст, наканаваны савецкім людзям, вытлумачваўся аўтарытэтнымі прадстаўнікамі ваеннай прозы ХХ ст. В. Астаф’евым, Р. Бакланавым, В. Казько з аўтабіяграфічных пазіцый. Пры стварэнні вобразаў усіх персанажаў разглядаліся месца, роля і паводзіны асобы ў соцыуме. Пісьменнікі-ветэраны і сведкі падзей мінулай вайны бралі пад увагу некалькі гістарычных пластоў: культ асобы Сталіна, Вялікая Айчынная вайна, нямецкі акупацыйны рэжым, пасляваенная рэальнасць і эпоха 1980–1990-х гг. Гэта сучаснасць, якая стала для большасці былых франтавікоў апошнім этапам іх жыццёвага шляху. Эпахальныя змены ва ўсіх сферах грамадства пэўным чынам паўплывалі на трактоўку Вялікай Айчыннай вайны і пашырэнне інфармацыі пра яе, прынеслі эканамічны крызіс і ідэалагічныя змены, што карэнным чынам адбілася на быцці, у тым ліку і былых удзельнікаў вайны ў постсавецкім соцыуме. Пісьменнікі актыўна выступілі супраць замоўчвання праўды пра найвялікшыя народныя ахвяры ў савецкія часы, а таксама супраць саркастычнага паніжэння тых маральных ідэалаў, якія заўсёды існавалі ў сумленных людзей поруч з дэкларатыўнымі і крывадушнымі лозунгамі мінулай эпохі.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

1. Сінькова, Л. Д. Беларуская «звышлітаратура»: літаратуразнаўчыя і літаратурна-крытычныя артыкулы / Л. Д. Сінькова. – Мінск : Кнігазбор, 2019. – 224 с.

2. Гісторыя беларускай літаратуры ХХ стагоддзя : у 4 т. / рэдкал.: У. В. Гніламёдаў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларус. навука, 2003. – Т. 4, кн. 2 : 1986–2000. – 975 с.

3. Басинский, П. Контуженная муза. Три очерка о Викторе Астафьеве [Электронный ресурс] / П. Басинский // ВикиЧтение. – Режим доступа: https://lit.wikireading.ru/34929. – Дата доступа: 10.01.2020.

4. 7. Фоменко, Л. Во имя любви (О творчестве Виктора Астафьева) [Электронный ресурс] / Л. Фоменко // Радио. – Режим доступа: https://md-eksperiment.org/post/20170613-vo-imya-lyubvi-o-tvorchestve-viktora-astafeva. – Дата доступа: 10.01.2020.

5. «Лейтенантская проза» – Григорий Бакланов [Электронный ресурс] // Воен. обозрение. – Режим доступа: https://topwar.ru/26087-leytenantskaya-proza-grigoriy-baklanov.html. – Дата доступа: 10.01.2020.

6. «Окопная правда» Григория Бакланова [Электронный ресурс] // Вести.ru. – Режим доступа: https://www.vesti.ru/doc.html?id=108367. – Дата доступа: 10.01.2020.

7. Виктор Козько. О писателе [Электронный ресурс] // Электронная библиотека LiveLib. – 2019. – Режим доступа: https://www.livelib.ru/author/328277-viktor-kozko. – Дата доступа: 10.01.2020.

8. Астафьев, В. Весёлый солдат [Электронный ресурс] / В. Астафьев // Электронная библиотека Lib-king.ru. – Режим доступа: https://libking.ru/books/literature-war/66061-viktor-astafev-veselyy-soldat.html. – Дата доступа: 10.01.2020.

9. Казько, В. Час збіраць косці : аповесці / В. Казько. – Мінск : Кнігазбор, 2014. – 340 с.

10. Астафьев, В. Печальный детектив [Электронный ресурс] / В. Астафьев // Электронная библиотека Литмир. – Режим доступа: https://www.litmir.me/br/?b=2034&p=1. – Дата доступа: 10.01.2020.

11. Астафьев, В. Так хочется жить [Электронный ресурс] / В. Астафьев // Электронная библиотека Lib-king.ru. – Режим доступа: https://libking.ru/books/prose/prosesu-classics/132682-7-viktor-astafev-tak-hochetsya-zhit.html#book. – Дата доступа: 10.01.2020.

Репозиторий БрГУ

12. Бакланов, Г. Свой человек [Электронный ресурс] / Г. Бакланов // Электронная библиотека Libra.ru. – Режим доступа: https://e-libra.ru/read/173188-svoy-chelovek.html. – Дата доступа: 10.01.2020.

Рукапіс паступіў у рэдакцыю 10.02.2020

***Bagaradava T. R.*** **Post-Soviet Context Through the Eyes of a Veteran of the Great Patriotic War (on the Material of the Agendas 1980–1990s of V. Astafieu, G. Baklanau, V. Kazko)**

*The article considers the understanding of the Great Patriotic War by Russian writers-front, representatives of «lieutenant prose» – V. Astafieu and G. Baklanau, as well as by the Belarusian writer, witness of military events – V. Kazko, in the genre created in the late Soviet and post-Soviet times. The authors are united by an appeal to the problem of veterans in the era of restructuring social transformation of the second half of the 1980–1990s. Writers reflected manifestations of the social and political crisis and its follow-up: processes of rethinking ideals, debunking of former ideological authorities, social and psychological injuries of the veteran warrior in the post-Soviet society.*

Репозиторий БрГУ